*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 47 (61) | Пятніца, 28 верасня 1945 г.

**АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСОВЕТ НА 26 ВЕРАСНЯ ВЫКАНАЎ ПЛАН ПАСТАЎКІ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ НА 81,4 ПРОЦАНТАЎ, У ФОНД ЧЫРВОНАЙ АРМІІ НА 110,3 ПРОЦАНТЫ.**

**СЯЛЯНЕ І СЯЛЯНКІ, ПА ПРЫКЛАДУ ПЕРАДАВІКОЎ, ХУТЧЭЙ РАЗЛІЧЫМСЯ З ДЗЯРЖАВАЙ ПА ХЛЕБАПАСТАЎКАХ!**

## ХУТЧЭЙ ЗАВЯРШЫЦЬ ХЛЕБАПАСТАЎКІ!

Па прыкладу перадавікоў хлебаздачы нашай вобласці, з кожным днём прыбаўляецца лік вёсак нашага раёна, разлічыўшыхся з дзяржавай па пастаўках збожжа. Акцябрскі сельсовет на 26 верасня выканаў пастаўку хлеба ў фонд Чырвонай Арміі на 110, 3 процантаў. Гэты сельсовет таксама стаіць напярэдадні завяршэння хлебапастаўкі дзяржаве. Набліжаюцца да завяршэння збожжапаставак Дзеткавіцкі і Худлінскі сельсоветы.

Аднак, многія сельсоветы, як Дзераўноўскі (старшыня т. Грыб), Каменскі (старшыня т. Антанюк), Гарадзецкі (старшыня т. Карлінчык) увесь час хлебнай кампаніі не выконваюць графіка пастаўкі збожжа, займаюць у раёне апошняе месца і тармозяць выкананне хлебапаставак раёнам. Каб своечасова выканаць план збожжанарыхтовак, гэтым сельсоветам з кожным днём патрэбна нарошчваць тэмпы хлебаздачы. Але атрымоўваецца наадварот. Горш таго, што 25 верасня з Дзераўноўскага сельсовета зусім не паступіла на базу Заготзярно ні кілограма хлеба, а з Каменскага ўсяго 119 кілограм, Гарадзецкага—22 кілограмы.

Такога становішча надалей цярпець не можна!

Патрэбна добра сабе ўявіць, што прышла восень, пайдуць няспынныя дажджы, дрэнна будзе вывозіць хлеб, бульбу і іншыя прадукты на здатачныя пункты. А пагэтаму перад савецкімі і партыйнымі работнікамі, перад кожным селянінам і сялянкай стаіць важнейшая задача—у бліжэйшы час поўнасцю завяршыць выкананне плана хлебапаставак.

## Указ
### ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
## Аб дэмабілізацыі другой чаргі асабовага састава Чырвонай Арміі

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

1. Правесці дэмабілізацыю другой чаргі—дзесяці наступных старэйшых узростаў радавога і сержанцкага састава Чырвонай Арміі (выключая войскі Далёкага Усходу).

2. Акрамя таго дэмабілізаваць з састава Чырвонай Арміі радавы і сержанцкі састаў наступных катэгорый:

а) Маючых закончаную вышэйшую, сярэднюю тэхнічную і сярэднюю сельскагаспадарчую адукацыю ўсіх спецыяльнасцей;

б) Працаваўшых да прызыва ў Чырвоную Армію настаўнікамі і выкладчыкамі ўсіх школ і навучальных устаноў;

в) Студэнтаў усіх вышэйшых навучальных устаноў другога і старэйшых курсаў (у тым ліку завочнікаў), не закончыўшых адукацыю ў сувязі з прызывам у Чырвоную Армію ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны;

г) Атрымаўшых па тры і больш раненняў у Вялікай Айчыннай вайне;

д) Прызваных на ваенную службу ў 1938 годзе і раней, і знаходзячыхся няспынна ў Чырвонай Арміі сем і больш год.

е) Усіх жанчын радавога і сержанцкага састава, акрамя жанчын-спецыялістак, якія выказалі жаданне застацца ў Чырвонай Арміі на пасадах ваеннаслужачых.

3. Дэмабілізацыю асабовага састава, у адпаведнасці з гэтым Указам, закончыць да канца 1945 года.

4. Матэрыяльна-бытавое забеспячэнне, прадугледжанае Законам аб дэмабілізацыі ад 23 чэрвеня 1945 года, распаўсюдзіць на асабовы састаў, дэмабілізуемых—у адпаведнасці з гэтым Указам.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.**

Масква, Крэмль

25 верасня 1945 года.

## 25 год комсамола Беларусі

24 верасня споўнілася 25 год Ленінскаму Комуністычнаму саюзу моладзі Беларусі. У Мінскім доме Чырвонай Арміі адбыўся ўрачысты пленум ЦК ЛКСМ Беларусі, прысвечаны гэтай знамянальнай даце. На пленуме быў зачытан Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб узнагароджанні Ленінскага комсамола Беларусі ордэнам Чырвонага Сцяга, за мужнасць, самаадданасць і геройства, праяўленыя комсамольцамі і моладдзю рэспублікі ў радах Чырвонай Арміі і ў партызанскіх атрадах у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**(ТАСС).**

## ЗАСЕЯНА 450 ГЕКТАРАЎ АЗІМЫХ

Пасяхова ідзе сяўба азімых культур у Галоўчыцкім сельсовеце. Азімымі культурамі засеяна 450 гектараў.

На тэму дня

# Узорна падрыхтавацца да зімы

Наблiжаецца зіма. Яе трэба сустрэць ва ўсеўзбраенні: загадзя падрыхтаваць усе жылыя памяшканні, прадпрыемствы, школы, дзіцячыя і лекавыя ўстановы, а таксама нарыхтаваць і завезці паліва.

Аднак, у нашым раёне гэтаму пытанню не ўдзеляецца ніякай увагі. Раённы комунальны аддзел (загадчык т. Орлоў) зусім не займаецца рамонтам кватэр. Для раёна на жыллёвае будаўніцтва адпушчана 25 тысяч рублёў, а зрасходвана ўсяго 18.155 рублёў. Многія дамы, у выніку недбайнасці кіраўнікоў комунальнага аддзела, расцягваюцца на дровы.

Пагражаючае становішча складваецца з палівам. На сёнешні дзень ні адно прадпрыемства райпромкамбіната, ні адна ўстанова не мае ні кубаметра паліва. Промкамбінат нарыхтаваў звыш 250 тон торфу, але ён знаходзіцца на месцы распрацоўкі, мокне пад дажджом, а перавазіць яго ніхто і не думае.

Таксама не маюць паліва школы, бальніца, амбулаторыя, дзетсад раённага цэнтра, але гарадскі совет (старшыня т. Стасевіч) пытаннем забеспячэння горада палівам не займаецца.

Такое-ж становішча і ў сельскіх советах. Большасць школ да гэтага часу не маюць дроў.

Пара неадкладна заняцца падрыхтоўкай да зімы, арганізаваць нарыхтоўку і вывазку паліва, рамонт жылой плошчы. Ад узорнай падрыхтоўкі да зімы залежыць нармальная работа прадпрыемстваў і ўстаноў у зімовых умовах.

## ЗВОДКА
Аб ходзе сяўбы азімых па раёну на 25 верасня

| №№ п/п | Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|---|
| 1 | Антопальскі | 88,2 |
| 2 | Акцябрскі | 87,0 |
| 3 | Аніскавіцкі | 87,0 |
| 4 | Заніўсеўскі | 82,4 |
| 5 | Галоўчыцкі | 82,3 |
| 6 | Асінавіцкі | 82,0 |
| 7 | Дзеткавіцкі | 78,9 |
| 8 | Дзямідавіцкі | 78,7 |
| 9 | Гарадзецкі | 73,3 |
| 10 | Каменскі | 72,0 |
| 11 | Першамайскі | 71,4 |
| 12 | Дзераўноўскі | 70,7 |
| 13 | Ілаўскі | 68,2 |
| 14 | Худлінскі | 57,3 |

Па раёну: 77,4



Уся наша краіна адзначала 200 годдзе з дня нараджэння вялікага рускага палкаводца Міхаіла Іларыёнавіча Кутузава.

На здымку: Пераможца Напалеона ў вайне 1812 года М. І. Кутузаў.

## ДЕСЯЦІТЫСЯЧНЫ НУМАР ГАЗЕТЫ „ПРАВДА"

24 верасня вышаў у свет дзесяцітысячны нумар газеты „Правда".

Гэта—выдатная падзея ў жыцці нашай Радзімы, вялікае свята совецкага друку.

Звыш 30 год „Правда" з чэсцю выконвае задачу сцяганосца ідэй партыі Леніна—Сталіна.

Совецкі Урад высока ацаніў плённую дзейнасць бальшавіцкай „Правды". За паспяховую работу па выхаванню працоўных у духу ідэй Леніна—Сталіна і выдатныя заслугі ў справе мабілізацыі совецкага народа на будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і абарону совецкай Радзімы газета „Правда" узнагароджана ордэнам Леніна.

Ордэнамі і медалямі ўзнагароджана таксама вялікая група работнікаў рэдакцыі, выдавецтва і друкарні „Правды".

# МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

Замежны друк шырока абмяркоўвае высунутае пытанне аб стварэнні „заходняга блока". У гэтым блоку, па меркаваннях некаторых аглядальнікаў, павінны нараду з Францыяй і Англіяй удзельнічаць Бельгія, Галандыя, Італія, Швецыя, Нарвегія, Данія і нават Іспанія.

Адзін з лідэраў французскай соцыялістычнай партыі Андрэ Філіпп, характэрызуючы задачы гэтага блока адзначыў, што ён павінен забяспечыць эканамічныя пагадненні гэтых краін, заключэнне таможнага саюза і нават стварэнне палітычнай федарацыі. „Заходні блок", піша Андрэ Філіпп, разам з каланіяльнымі імперыямі Францыі, Бельгіі і Галандыі, з'явіцца дастатковай сілай для таго, каб на роўных правах падтрымліваць адносіны з двума вялікімі дзяржавамі нашай эпохі—СССР і ЗША".

У такой адкрытай форме ініцыятары блока прапануюць, нараду з існуючай міжнароднай арганізацыяй Аб'яднаных Нацый, стварыць асобую арганізацыю, супроцьстаячую Совецкаму Саюзу і Злучаным Штатам Амерыкі.

Цікава, што ідэя заходняга блока была высунута яшчэ ў кастрычніку 1944 года іспанскім дыктатарам і гітлераўскім наймітам—Франко. Зараз абмяркаванне гэтага плана супала з заключэннем эканамічнага пагаднення паміж французскім урадам і Іспаніяй.

Французская газета „Се суар" з абурэннем піша, што „французы былі ашаламлены, даведаўшыся аб заключэнні эканамічнага дагавора з мяцежным урадам Франко". Францыя абавязалася пастаўляць у Іспанію фасфаты, баксіты, жалезны лом, машыны, забяспечыць электраэнергіяй.

Няма сумнення ў тым, што стварэнне заходняга блока замацавала-б рэжым Франко якраз у той момант, калі ўсе прагрэсіўныя сілы свету патрабуюць яго ліквідацыі. Многія дэмакратычныя газеты Францыі і Англіі лічаць, што заходні блок прывядзе не да згуртавання сіл вялікіх дзяржаў, а да іх раз'еднання. Старшыня выканкома англійскай лейбарысцкай партыі Ласкі гэтымі днямі заявіў: „Я буду з усёй сілай выступаць супроць стварэння заходняга блока, калі Совецкі Саюз супроць гэтага—таму што лічу, што англа-совецкая дружба з'яўляецца асновай міра і прагрэса".

В. Грышанін.

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

ГЛ 14868 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 2.